Раздел 2
ИСТОРИЯ БЕЛАРУСИ

КРЫНІЦЫ ПАПАЎНЕННЯ ДВАРАНСТВА Ў БЕЛАРУСІ

А. П. Жытко, г. Мінск

Пытанне аб паходжанні і крыніцах папаўнення дваранскага саслоўя ў Беларусі выклікае значны навуковы інтарэс. Яго высвятленне дазваляе вызначыць вытокі саслоўнай устойлівасці дваранства ва ўмовах фарміравання класавага грамадства ў краіне. Існаванне гэтага саслоўя на этапе, калі палітычныя партыі адсутнічалі, а грамадзянская супольнасць не сфарміравалася, магло іграць як станоўчую, так і адмоўную ролю. На справе, як звычайна бывае, мела месца і тое і другое. Аднак савецкая гістарыяграфія, як вядома, карысталася толькі чорна-белымі фарбамі. Што тычыцца гэтага пытання, то яно павінна было падавацца толькі ў негатыўнай афарбоўцы. Таму ў сацыяльнай структуры грамадства дваранства адносілася да найбольш рэакцыйнай яго часткі. Пры панаванні такога метадалагічнага падыходу вывучэнне яго паходжання і крыніц папаўнення прызнавалася немэтазгодным.

А між тым звяртанне да гістарычных каранёў і крыніц папаўнення дваранства неабходна не толькі для вывучэння яго ўласнай гісторыі, але і раскрыцця сутнасці палітыкі царскага ўрада ў гэтым пытанні. У прыватнасці, мае патрэбу ва ўдакладненні палажэнне савецкай гістарыяграфіі аб дваранстве як галоўнай сацыяльнай апоры царызму. Каб пераканацца, што гэта не зусім так, і што пытанне гэтае мае больш шырокае значэнне, неабходна ўсебакова, на падставе навуковых прынцыпаў высветліць як паходжанне, так і крыніцы папаўнення дваранства. На гэтай падставе можна зразумець, у якіх стасунках знаходзіліся як саслоўныя, так і дзяржаўныя інтарэсы дваранства.

Для Беларусі важным з'яўляецца высвятленне праблемы, якая звязана з асаблівасцямі падзелу дваранства на патомнае і асабовае, лёсам шматлікай шляхты і інш.

Расійскае заканадаўства вызначала, што «дваранская назва... выцякае ад якасці і дабрадзейнасці мужоў, якія начальствавалі ў старажытнасці, вылучыліся заслугамі... і набылі нашчадкам сваім назвы высакародных. Высакароднымі разумеюцца ўсе тыя, якія альбо ад продкаў высакародных народжаны, альбо манархамі гэтай добрай якасці нададзены» [1, ст. 15]. Як бачым, дваранская годнасць, з аднаго боку, ёсць спадчынная якасць нашчадкаў старажытных служылых родаў, а з другога – яна можа быць і нададзена манархам. Такім чынам, юрыдычны сэнс гэтага заканадаўчага артыкула сведчыць аб тым, што ў склад вышэйшага саслоўя маглі трапіць і выхадцы з іншых саслоўяў. Да таго ж, наданне тытула дваранства непасрэдна вярхоўнай уладай не было адзіным шляхам уваходжання ў «высакародную» сацыяльную групу. Заканадаўствам прадугледжваліся наступныя шляхі атрымання недваранамі дваранскіх правоў: 1) ласка манарха; 2) дасягненне адпаведнага чыну на вайскавой ці грамадзянскай службе; 3) узнагароджанне ордэнам.

Неабвержанымі доказамі дваранскага стану прызнаваліся:

1) даравальныя граматы на дваранства ці на тытулы князей, графаў альбо баронаў;
2) дваранскія радаслоўныя кнігі і спісы дэпартамента герольдыі;

3) даравальныя ад гасудароў гербы;
4) патэнты на чыны, якія даюць дваранскую годнасць;
5) доказы ўзнагароджвання ордэнам;
6) доказы праз даравальныя і пахвальныя граматы;
7) указы на дараванне зямель і вёсак...;
8) указы ці граматы на дараваныя землі і вотчыны, нават калі яны і выбылі з роду [2,. 559].

Па расійскім заканадаўстве на тэрыторыі Беларусі патомнае дваранства атрымалі не толькі ўладальнікі маёнткаў і прыгонных у былой Рэчы Паспалітай, але і тыя, хто служыў у Каралеўстве Польскім і ВКЛ. Гэтыя служачыя падзяляліся на тры групы: 1) дзяржаўных служачых (ад ваяводы да каморнікаў у ВКЛ – усяго 36 пасад); 2) прыдворных чыноў (ад вялікага падкаморыя да шамбяляна – усяго 12 пасад); 3) земскіх служачых – 80 пасад [2,. 28 -29].

У залежнасці ад паходжання і заслуг усё дваранства яшчэ з часоў Пятра I падзялялася на два асноўныя падраздзелы: патомнае і асабовае. Акрамя гэтага, на Беларусі былі і свае асаблівасці. Па расійскаму заканадаўству вышэйшае саслоўе тут дзялілася на ўласна дваранства і быўшую «польскую» шляхту. Прыпынімся больш падрабязна на характарыстыцы гэтых катэгорый.

Патомнае дваранства, якое перадавалася ў спадчыну з пакалення ў пакаленне, з'яўлялася той часткай вышэйшага саслоўя, на якую ў поўнай ступені распаўсюджваліся прывілеі, што і выдзяляла яго ў асобую сацыяльную групу. Шмат якія прывілеі захаваліся за ім і пасля скасавання прыгону, аб чым мы будзем гаварыць далей.

Патомнае дваранства само па сабе не з'яўляпася аднародным. У залежнасці ад шляхоў набыцця дваранскай годнасці яно падзялялася на шэсць разрадаў: 1) дваранства нададзенае ці сапраўднае; 2) дваранства вайсковае; 3) дваранства, атрыманае ў выніку выслугі пэўнага чыну на грамадзянскай службе ці ўзнагароджання ордэнам; 4) замежныя дваранскія роды; 5) тытулованае дваранства; 6) старажытныя шляхетныя роды [1, ст. 17]. Такая градацыя была зроблена яшчэ пры Кацярыне II, відаць, пад уплывам прадстаўнікоў знатных родаў, каб аддзяліць апошнія тры разрады ад першых.

Другі і трэці разрады складалі роды, якія атрымалі дваранства дзякуючы якім-небудзь заслугам. Большую частку першага разраду, відаць, складалі патомкі знаці захопленых Расіяй тэрыторый. Магчыма, гэта былі збяднеўшыя, маламаёмасныя роды. Усе яны павінны былі прадставіць дакументальныя доказы прыналежнасці да вышэйшага нацыянальнага саслоўя, якія разглядаліся губернскімі дэпутацкімі сходамі, Дзяржаўным саветам, Камітэтам міністраў ці Сенатам. На аснове іх заключэнняў цар зацвярджаў альбо не зацвярджаў такія роды ў дваранстве. Адсюль і пайшоў тэрмін «сапраўднае дваранства». У прыватнасці, такая працэдура датычылася шляхты Беларусі. Гэтую думку пацвярджае і аналіз алфавітных спісаў дваранскіх родаў Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў, якія былі занесены ў дваранскія радаслоўныя кнігі.

Сярод 1371 дваранскага роду Магілёўскай губерні ў 1909 г. налічваліся 273 фамілії (19,9 %) нададзенага ці сапраўднага дваранства. 170 фамілій (12,4 %) набылі дваранскую годнасць на вайсковай службе, 270 (19,7 %) атрымалі дваранства за заслугі на грамадзянскай службе ці праз узнагароджанне ордэнам, 3 (0,2 %) (Грабуа, Пішчэвіч, Францэссон) – замежныя роды. 13 (1,0 %) – тытулаванае дваранства [3]. 691 (46,8 %) – старажытныя роды [4, 1 – 25]

У Мінскай губерні адпаведна шасці разрадам родаў, якія былі ўключаны ў губернскую радаслоўную кнігу да 1903 г., яны размеркаваліся наступным чынам: 1) 1005 фамілій (49,2 %); 2) 97 (4,7 %); 3) 162 (7,9 %); 4) адсутнічаюць; 5) 5 (0,2 %) – князі Друцкія-Любецкія, князі Радзівілы, графы Гуттэн-Чапскія, графы Развадоўскія, графы Тышкевічы; 6) 777 фамілій (38,0 %). Усяго намі налічана 2046 фамілій. Па спісе значыцца 2023 роды і ў дадатак да іх 15 татарскіх фамілій, якія былі запісаны асобна [5,. 1–162]. Справа ў тым, што некаторыя роды адначасова ўнесены ў розныя разрады. Напрыклад, да першага, трэцяга і шостага. Былі і іншыя камбінацыі.

У Гродзенскай губерні на 1900 г. дваранскія роды размяркаваліся наступным чынам: 1) 364 фаміліі (38,1 %); 2) 73 (7,6 %); 3) 124 (13,0 %); 4) 3 (0,3 %) – роды Бер, Вірыон, О'Брыен-дэ-Ляссі; 5) 5 (0,5 %) – графы Грабоўскія, князі Друцкія-Любецкія, графы Кассакоўскія, князі Массальскія, князі Святаполк-Чацвярцінскія; 6) разрад – 387 (40,5 %) фамілій. Усяго 956 родаў. Акрамя гэтага, 26 фамілій аказаліся за межамі разрадаў [6].

Як бачым, значную частку вышэйшага саслоўя Беларусі складалі дваране першага разраду (Магілёўская губерня – 273 (19,9 %), Гродзенская – 364 (38,1 %), Мінская – 1005 (49,2 %). У той жа час у 9 вялікарускіх губернях (Уладзімірская, Калужская, Кастрамская, Ніжагародская, Наўгародская, Пензенская, Разанская, Смаленская, Сімбірская) на пачатку XX ст. дваран сапраўдных было толькі 755 фамілій (5,6 %) [7,. 32 – 33]. Высокая доля сапраўдных дваран Беларусі – сведчанне таго, што гэта былі ў асноўным збяднелыя шляхецкія роды, якія пацвердзілі сваё дваранскае паходжанне. Акрамя гэтага, калі параўнаць спіс землеўласнікаў Мінскай губерні і спіс дваранскіх родаў першага разраду, то, за рэдкім выключэннем, сапраўдныя дваране былі сярэднімі ці дробнымі землеўласнікамі. У сувязі з гэтым яшчэ адзін факт. 796 фамілій (79,2 %) былі занесены ў першы разрад радаслоўнай кнігі Мінскай губерні ў час паміж падзеламі Рэчы Паспалітай і скасаваннем прыгону. У 60-я гады – 130 (12,9 %) фамілій, 70-я – 49 (4,9 %), 80-я – 10 (1,0 %), 90-я – 20 (2,0 %) фамілій [5,. 1 – 162]. Справа ў тым, што пасля падаўлення паўстання 1863 г. была значна ўскладнена працэдура доказу прыналежнасці да шляхты ў часы Рэчы Паспалітай.

У той жа час было няшмат дваран, якія атрымалі дваранскую годнасць за службу ці ўзнагароджаных ордэнам. Так, калі ў названых вышэй рускіх губернях дваране другога і трэцяга разрадаў складалі 63 % [7, 32 – 33], то ў Магілёўскай губерні – 32,1 %, Мінскай – 12,6 %, а Гродзенскай – 20,6 %. Нізкі працэнт «служылага» дваранства, асабліва па Мінскай губерні, тлумачыцца тым, што з другой паловы XIX ст. католікам было забаронена займаць службовыя пасады на тэрыторыі Беларусі. Акрамя гэтага, ускладнілася і сама працэдура атрымання патомнага дваранства.

Упершыню парадак набыцця правоў вышэйшага саслоўя асобамі недваранскага паходжання шляхам выслугі юрыдычна быў замацаваны пры Пятры I. У Табелі аб рангах 1722 г. адзначалася, што ўсе асобы, якія на вайсковай службе дасягнулі першага афіцэрскага чыну, а на грамадзянскай – чыну VIII класа, становяцца патомнымі дваранамі [8]. Пазней Кацярына II замацавала гэта палажэнне і дапоўніла яго ўзнагароджаннем ордэнам [9]. У сувязі з гэтым рэзка павялічыўся прыток прэтэндэнтаў на дваранскую годнасць. Толькі з 1825 да 1845 г. вышэйшае саслоўе імперыі павялічылася амаль на 20 тыс. чалавек па службе і ордэнах [10,. 33]. Такая тэндэнцыя палохала ўрадавыя кругі, іх непакоіла чысціня дваранскай годнасці. У сувязі з гэтым Мікалай I маніфестам ад 11 чэрвеня 1845 г. павысіў клас чыноў, якія давалі права на

патомнае дваранства, да штаб-афіцэрскага на вайсковай службе (VIII клас) і да V класа – на грамадзянскай [11]. З 1853 г. гэтае ж права атрымалі капітаны корпуса інжынераў і корпуса горных інжынераў [12]. Па ўказу Аляксандра II ад 9 снежня 1856 г. быў устаноўлены парадак, які ў асноўных рысах захаваўся да 1917 г. Патомнае дваранства цяпер даваў на вайсковай службе чын палкоўніка ці капітана першага рангу, а на грамадзянскай службе – правадзейнага стацкага саветніка (IV клас). Адпамя гэтага, такое права атрымалі кавалеры першых ступеняў усіх расійскіх ордэнаў, за выключэннем св. Георгія і св. Уладзіміра, усе ступені якіх давалі права на патомнае дваранства [13].

Аднак з пашырэннем дзяржаўнага апарату павялічылася і колькасць прэтэндэнтаў на дваранскую годнасць. Так, чыноўнікаў IV класа ў 1858 г. налічвалася па імперыі 674, а ў канцы XIX ст.– 2687 чалавек. Яшчэ больш магчымасцей было атрымаць патомнае дваранстра праз узнагароджанне ордэнамі, асабліва ордэнам Уладзіміра III і IV ступеней. За 1875–1896 гг. гэтым ордэнам III ступені было ўзнагароджана амаль 11 тыс., а IV – 31 тыс. чалавек [2, .25].

Знайсці зводныя даныя аб такіх асобах па беларускіх губернях нам не ўдалося. У прыватнасці, у Мінскай губерні ў 1897 г. на службе знаходзіліся ў чыне IV класа толькі пяць чалавек: губернатар, губернскі прадвадзіцель дваранства, губернскі ўрачэбны інспектар (доктар медыцыны) і два неадменных члены губернскай па сялянскіх справах канцылярыі [14, 2 – 7]. Кавалераў ордэнаў першай ступені, якія былі зволены ў запас і пражывалі ў Мінскай губерні, у 1883 г. не значылася. Узнагароджаных ордэнам Уладзіміра III ступені – 3 чалавекі, IV – 19; ордэнам Георгія адпаведна 1 чалавек і 10 чалавек [14, 1 – 46]. Але гэта толькі адстаўнікі. Вызначыць, колькі служачых чыноўнікаў было ўзнагароджана ордэнамі па фармулярных спісах, практычна немагчыма, таму што яны перасылаліся толькі на месца новай пасады чыноўніка

Указам ад 16 жніўня 1887 г. было ўстаноўлена, што для атрымання ордэна Уладзіміра IV ступені неабходна праслужыць у класных ці афіцэрскіх чынах не менш за 20 гадоў. У 1892 г. ордэн быў уведзены ў агульную паступовасць узнагародаў. Цяпер для яго атрымання неабходна было бездакорна праслужыць 35 гадоў [2,. 25, 62].

Пытанне аб абмежаванні доступу у вышэйшае саслоўе зноў узнікла ў 1897 г., калі Мікалай II заснаваў Асобую нараду па справах дваранства. Па запатрабаваных нарадай ад дэпартамента герольдыі звестках вынікала, што ў 1875–1896 гг. правы патомных дваран па імперыі атрымалі дадаткова амаль 40 тыс. чалавек. Сярод іх 12741 – па чынах і 26794 – па ордэнах [2, л. 13]. Справа ў тым, што, па меркаванні Дзяржаўнага савета ад 4 красавіка 1874 г., у патомнае дваранства прыпісваліся ўсе члены сям'і асобы, якая атрымала гэтае права. Раней правы вышэйшага стану распаўсюджваліся толькі на дзяцей, якія нарадзіліся пасля атрымання іх бацькамі дваранскай годнасці [7,. 28].

Пытанне аб шляхах далучэння да вышэйшага саслоўя было адным з важнейшых у дзейнасці Асобай нарады. Большасць яе членаў выказалася за павышэнне службовай адзнакі, якая даравала права вышэйшага стану. Тым самым нарада імкнулася забяспечыць «чысціню» саслоўя ад выхадцаў не з дваран. Указвалася, што ў большасці выпадкаў атрыманню чына правадзейнага стацкага саветніка папярэднічала ўзнагароджанне ордэнам Уладзіміра IV ступені. Нарада выказалася за перагляд Статуса ордэна альбо за выключэнне з яго чыноў IV ступені на права саіскання дваранскага звання.

Разгледзеўшы рэкамендацыі Асобай нарады, Дзяржаўны савет у 1900 г. адзначыў, што «дзяржаўная служба аплачваеца вельмі мізэрна. Адзіным прывабным бокам яе з'яўляюцца звязаныя з ёю правы і перавагі, у тым ліку і атрыманне дваранскай годнасці» [15,. 53 зв.].

Імянны ўказ Сенату ад 29 мая 1900 г. пацвердзіў асноўныя палажэнні ўказа ад 9 снежня 1856 г. аб парадку ўвядзення ў дваранскую годнасць па службе і адмяніў гэта права для ўзнагароджаных ордэнам Уладзіміра IV ступені. Трэцяя ступень ордэна па-ранейшаму давала права на атрыманне патомнага дваранства. Але ім маглі цяпер быць узнагароджаны тыя асобы, якія мелі чын не ніжэй за правадзейнага стацкага саветніка на грамадзянскай службе альбо не ніжэй за палкоўніка ці капітана I рангу – на вайсковай [16]. У 1902 г. гэты ўказ быў дапоўнены палажэннем згодна з якім патомнае дваранства маглі атрымаць тыя, хто дасягнуў чына правадзейнага стацкага саветніка альбо палкоўніка ці капітана I рангу толькі на службе, а не ў час знаходжання ў адстаўцы [17, 31].

Што ж тычыцца недзяржаўных служачых, то Дзяржаўны савет у 1900 г. адзначаў, што «ён далёкі ад думкі не прызнаваць значэння для дзяржавы па іншай, акрамя дзяржаўнай службы, ролі дзейнасці. Гэта дзейнасць заўжды мела і з года ў год атрымлівала ўсё большае значэнне. Асобы, якія прысвяцілі сябе навуцы і мастацтву, а таксама якія працуюць у галіне грамадскай, сельскагаспадарчай, прамысловай і гандлёвай дзейнасці, багата садзейнічаюць духоўнаму развіццю і матэрыяльнаму поспеху краіны. У гэтых адносінах заслуга іх перад дзяржавай відавочна. Але нельга не засяродзіць увагу, што ў большасці выпадкаў, акрамя натуральнага прызвання да той ці іншай дзейнасці, матывам для заняткаў ёю з'яўляецца імкненне да лепшага заробку» [15,. 56]. Таму такія асобы маглі атрымаць дваранскую годнасць толькі па міласці манарха пры ўмове, што іх дзейнасць накіравана на карысць дзяржавы [15,. 57].

У Асобай нарадзе па справах дваранства выказвалася меркаванне аб магчымасці атрымання права дваранства буйнымі землеўласнікамі не з дваран, якія валодалі зямлёй на працягу не менш чым 20 гадоў, мелі сярэдні адукацыйны цэнз і набылі сваёй службовай ці грамадскай дзейнасцю павагу мясцовага насельніцтва [15, 58]. Гэта матывавалася тым, што колькасць дваран-землеўласнікаў паступова памяншалася. Таму з кожным годам усё больш не хапала сродкаў на ўгрыманне органаў дваранскага кіравання, апек, кадэцкіх корпусаў і г. д. Аднак Дзяржаўны савет, які разглядаў гэту прапанову, выказаўся катэгарычна супраць. «Зразумела, нельга адмаўляць, што ў інтарэсы саслоўя ўваходзіць павелічэнне колькасці паменшанага дваранства. Гэта забяспечыла б бесперашкоднае замяшчэнне выбарных дваранскіх пасад і ўзмацніла б уплыў дваранства ў мясцовым жыцці. Але дваранству неабходны толькі такія мясцовыя дзеячы, якія безумоўна прасякнуты дваранскімі традыцыямі і паняццямі. Ці знойдзецца ў вышэйзгаданым асяроддзі шмат асоб, якія задаволілі б гэтым патрабаванням? Прынамсі, у цяперашні час на гэта пытанне можна даць толькі адмоўны адказ» [15,. 59].

Такім чынам, асноўнай крыніцай папаўнення дваранства імперыі з'яўляліся выхадцы з непрывілеяваных саслоўяў, якія дасягнулі пэўнага чыну па вайсковай (другі разрад) ці грамадзянскай службе (трэці разрад), альбо ўзнагароджаныя расійскім ордэнам. З аднаго боку, самаўладдзе імкнулася абмежаваць колькасць прэтэндэнтаў на атрыманне дваранскай годнасці, каб зберагчы «чысціню» саслоўя, яго каста-

вынь, а з другога – з развіццём эканомікі, культуры, мілітарызацыяй краіны самаўладны рэжым не мог існаваць інакш, як пашыраючы кола чыноўнікаў і вайсковцаў рознага ўзроўню. Абсалютнай манархіі, каб існаваць, трымаць краіну ў сваіх руках і пад сваім кантролем, неабходна было ўзмацняць адміністрацыйна-каманднаю сістэму за кошт стварэння больш буйнага чыноўніцкага і вайсковага апарату. Шляхетнае саслоўе рэкрутавалася не з асяроддзя прадпрымальнікаў, гандлёвай буржуазіі, дзеячаў навукі і культуры, а з вышэйшага адміністрацыйнага апарату і афіцэрства, што не магло паўплываць на палітычнае, эканамічнае і культурнае развіццё імперыі.

Да апошніх трох разрадаў адносіліся так званыя карэнныя, ці стаўбавыя дваране. У другой палове XIX ст. іх колькасць павялічвалася за кошт натуральнага прыросту, мабыць, толькі за нязначным выключэннем чацвёртага і пятага разрадаў.

Да чацвёртага разраду адносіліся «замежныя шляхетныя роды». Заканадаўствам прадугледжвалася, што высакародныя замежныя фаміліі маглі прасіць сабе рускае дваранства пры ўмове аказання імі якіх-небудзь паслуг на рускай службе. Пры гэтым яны павінны былі прыняць рускае падданства [18]. Як ужо адзначалася, у Гродзенскай і Магілёўскай губернях такіх родаў, занесеных у дваранскія радаслоўныя кнігі, было па тры. У Мінскай губерні іх навогул не існавала. Але адсутнасць замежных фамілій у радаслоўных кнігах зусім не азначае, што гэтыя роды не пражывалі ў той ці іншай беларускай губерні. Так, па перапісу 1897 г. у Віленскай губерні (4 паветы) было зарэгістравана 19 чалавек, выхадцаў з іншых дзяржаў, Віцебскай губерні (5 паветаў) – 25, Гродзенскай (6 паветаў) – 144, Мінскай – 99 і Магілёўскай губерні – 53 чалавекі. Усяго ж у 35 паветах 5 заходніх губерняў пражывала 340 патомных дваран, выхадцаў з іншых дзяржаў. З іх 97 чалавек жылі ў гарадах. Па полу яны размеркаваліся наступным чынам: мужчын – 62 чалавекі, а жанчын – 278 [19]. З гэтага вынікае, што значная частка замежных жанчын была замужам за мясцовымі дваранамі-землеўласнікамі.

Пяты разрад складала тытулаванае дваранства. Расійскае заканадаўства прадугледжвала правы карыстання ганаровымі тытуламі: 1) нашчадкам старажытных рускіх і літоўскіх (беларускіх – аўтар) князёў; 2) асобам, якія атрымалі ганаровае дваранства ад расійскіх імператараў; 3) асобам, якія былі ўдастоены тытула асабіста імператарам; 4) тым, каму вышэйшай уладай прадстаўлена права карыстацца ганаровай годнасцю, падараванай замежнай дзяржавай. Усе тытулы падзяляліся на княжацкія, графскія і баронскія [20, 1].

На пачатку XX ст. толькі ў трох беларускіх губернях (Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай) налічвалася 23 тытулаваных роды. З іх 12 княжацкіх, 9 графскіх і 2 баронскіх. На самай справе прадстаўнікоў тытулаваных родаў на тэрыторыі Беларусі было значна больш, чым іх значылася ў радаслоўных кнігах. Так, сярод буйных землеўласнікаў Мінскай губерні ў 1902 г. было, акрамя адзначаных вышэй, яшчэ 4 князі (у тым ліку і вялікія князі Мікалай Мікалаевіч і Пётр Мікалаевіч), 14 графаў і 4 барона [21, 1 – 67]. Тое ж самае назіралася і ў іншых беларускіх губернях.

Увасабленнем жывой сувязі з сярэднявеччам былі старажытныя дваранскія фаміліі, якія ўваходзілі ў шосты разрад. Частка іх адначасова была запісана і ў пяты разрад. Старажытнымі рускімі родамі прызнаваліся тыя, якія былі занесены ў Аксамітавую кнігу, ці тыя, хто мог даказаць сваю прыналежнасць да дваранства за 100 гадоў да выдання «Даравальнай граматы дваранству». гэта значыць да 1685 г. [7, 32].

У другой палове XIX ст., як і раней, пэўная частка свецкага грамадства старажытнасць дваранскага роду лічыла больш ганаровай з усіх высокіх тытулаў. Як пісаў даследчык дваранскай генеалогіі Я. П. Карновіч, гэта было выклікана тым, што «тытул можа атрымаць кожны просты чалавек, тады як даць «шляхетных» продкаў сабе, якіх яна не мае па нараджэнню, не ў стане ніякая ўлада, як бы магутна яна не была» [18,. 183].

Разам з тым ў Беларусі не існавала выразнай градацыі паміж рознымі разрадамі. Некаторыя нашчадкі старажытных родаў збяднелі, страцілі маёмасць ці дакументы, якія маглі б пацвердзіць іх шляхетнае паходжанне. Яны на працягу многіх гадоў, а то і дзесяцігоддзяў, адшуквалі сваё дваранскае паходжанне. І калі ім гэта ўдавалася, то іх не абавязкова запісвалі ў шостую, а хутчэй – у першую частку дваранскай радаслоўнай кнігі [22, 1 – 40].

Агульную колькасць старажытнага дваранства, як і першых пяці разрадаў, цяжка вызначыць. У радаслоўных кнігах Гродзенскай губерні дваран шостага разраду значылася 387 (40,5 %) фамілій, Мінскай – 777 (38,0 %) і Магілёўскай – 69 (46,8 %). У 8 велікарускіх губернях сярэдняя колькасць старажытных родаў складала каля 28 %, а ў адзначаных трох беларускіх – 41,8 %. Гэта тлумачыцца тым, што ў ВКЛ было значна прасцей далучыцца да вышэйшага саслоўя з непрывілеяваных груп насельніцтва, чым у Расіі.

Прыналежнасць да любога з пералічаных разрадаў у разглядаемы час не давала якіх-небудзь асобных прывілеяў. Толькі ваенныя дваране мелі пэўныя перавагі перад дваранамі-чыноўнікамі. Афіцэры раней на 2–3 гады атрымлівалі дваранскую годнасць. Але гэта абумоўлівалася не столькі прыналежнасцю да разраду, колькі традыцыяй перавагі вайсковай службы над грамадзянскай. Дваране пятага і шостага разрадаў хутчэй за ўсе карысталіся псіхалагічнай перавагай над іншымі. Акрамя гэтага, яны традыцыйна з'яўляліся буйнейшымі землеўласнікамі, уладальнікамі прамысловых і гандлёвых устаноў. Аднак у цэлым патомнае дваранства карысталася значнымі перавагамі ў параўнанні з іншымі саслоўямі. Да скасавання прыгону толькі яны мелі права на куплю населеных зямель і прыгонных. Пасля 1861 г. за патомнымі дваранамі захаваліся прывілеі пры паступленні ў навучальныя ўстановы і на дзяржаўную службу. Пад час рэвалюцыі 1905–1907 гг. паводле царскага ўказа ад 5 кастрычніка 1906 г. абвяшчалася, што ўсе расійскія падданыя, за выключэннем іншародцаў, будуць мець роўныя правы. Але на самай справе за патомнымі дваранамі захаваліся пэўныя прывілеі. Так, дваранскія таварыствы маглі адкрываць пансіёны-прытулкі для выхаванцаў-дваран сярэдніх навучальных устаноў; засноўваць пры дапамозе казны саслоўныя стыпендыі для сыноў патомных дваран у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах, хадайнічаць аб адкрыцці дваранскіх кадэцкіх корпусаў і г. д. [23? 8, 13].

Літаратура

1. Свод законов Российской империи.– СПб.: Изд-во Кодификац. отд. при Гос. совете, 1876.– Т. 9.
2. РДГА ў С.-Пецярбурзе. ф. 1283, І справаводства, воп. І, спр. 5, ч. І.
3. Бароны Брэмзен, графы Грабоўскія, князі Крапоткіны, князі Дандуковы-Корсакавы, князі Любамірскія, князі Мяшчэрскія, бароны фон-Нолькэн, князі Абаленскія, князі Эрыванскія-Паскевічы, графы Сумарокавы, князі Друцкія-Сакалінскія, графы Талстыя, графы Цукатто.

4. Алфавитный список дворянских родов, внесенных в родословные дворянские книги Могилевской губернии. Составлен в 1908 году – Могилев: Тип. Я.Н. Подземского, 1908.
5. Алфавитный список дворянским родам Минской губернии, внесенных в дворянскую родословную книгу по 1-е июля 1903 года.– Минск: Губерн. тип., 1903.
6. Список дворянских родов Смоленской, Могилевской, Бессарабской и Гродненской губерний.– Смоленск: Губерн. тип., 1908.
7. Корелин А.П. Дворянство в пореформенной России. 1861–1904 гг. Состав, численность. корпоративная организация.– М.: Наука, 1979.
8. ПСЗ. I-е собр. Т. 6. № 3890.
9. ПСЗ. I-е собр. Т. 22. № 16187.
10. РДГА ў С.-Пецярбурзе, ф. 1283, воп. I, Iсправа-ва, 1897г., спр. 218.
11. ПСЗ. 2-е собр. Т. 20. Отд. I. № 19086.
12. ПСЗ. 2-е собр. Т. 28. Отд. I. № 26939; № 26996.
13. ПСЗ. 2-е собр. Т. 31. № 31236.
14. НГАБ, ф. 299, воп.7, спр. 356/
15. РДГА ў С.-Пецярбурзе, ф. 1283, воп. 1, 1-е справа-ва, спр. 25.
16. ПСЗ. 3-е ообр. Т. 20. Отд. I. № 18681.
17. Блосфельдт Г.Э. Сборник законов о российском дворянстве. 1901-1902 гг.– СПб.: Д.В. Чичинадзе, 1903.– 46 с.
18. Карнович Е. П. Родовые прозвания и титулы в России и слияние иностранцев с русскими.– СПб.
19. Падлічана па: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. СПб., 1900. Вып. 4. Виленская губерния. Тетрадь 2. СПб., 1899. Вып. 5. Витебская губерния. Тетрадь 2. С. 99–107; СПб., 1904. Вып. 11. Гродненская губерния. С. 44–45; СПб., 1904. Вып. 22. Минская губерния. С. 40–41; СПб., 1903. Вып. 23. Могилевская губерния.
20. Списки титулованным родам и лицам Российской империи.– СПб., 1892.
21. Список землевладельцев Минской губернии, владеющих 500 десятинами земли и более в 1902 году // Памятная книжка Минской губернии на 1904 год.– Минск: Губерн. тип., 1903.– Приложение.–6/
22. НГАБ, ф. 2512, воп. 3. спр. 10.
23. Блосфельдт Г. Э. Российское дворянство. Указания и разъяснения. 1901-1910 гг.– СПб.: Д.В. Чичинадзе, 1910.

СОЦИАЛЬНАЯ ПОЛИТИКА ЦАРИЗМА НА ЖЕЛЕЗНЫХ ДОРОГАХ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX ВВ.

П. А. Тупик, г.Минск

Тяжёлые материальные условия существования рабочих и низших служащих железных дорог Беларуси и их семей становились еще более трудными в случае инвалидности или смерти рабочего или служащего. До начала 90-х годов никаких пособий и пенсий железнодорожным рабочим в подобных трагических случаях не полагалось.

В 1893 г. на казенных железных дорогах были введены пенсионные кассы, крайне невыгодные для рабочих. Участие в них было для всех обязательным после года работы, а небольшую пенсию из нее можно было получать только через 10